# СВЯТЛО НАДЗЕІ

## 110 гадоў таму 17 верасня нарадзілася першы старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава

**У гісторыі любой краіны ёсць нямала яскравых, таленавітых жанчын, справы якіх служаць прыкладам для пераймання, яны з'яўляюцца гонарам для сваіх дзяржаў. Для Беларусі, СССР такой яскравай асобай была Надзея Рыгораўна Грэкава, першы старшыня Вярхоўнага Савета БССР, адзіная жанчына ў палітычнай гісторыі Савецкага Саюза, абраная на такі высокі пост на ўсенародных выбарах у 1938 годзе. Выконвала яна гэтыя абавязкі 9 гадоў і з'яўлялася па Канстытуцыі фактычна кіраўніком рэспублікі. Пры гэтым Грэкава адначасова з'яўлялася сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі па прамысловасці.**



Н. Грэкава з дэлегатамі XVIII з'езда ВКП(б) (7-я злева ў першым радзе), сярод якіх і І. В. Сталін (у цэнтры першага рада). 1939 год.

### «Блаславіў» асабіста Сталін

Гэта быў факт, беспрэцэдэнтны не толькі для СССР, але і для Еўропы. Грэкава ўступала ў вялікую палітыку зусім маладой. Ёй было ўсяго 28 гадоў, яна з рабочых, з Ляхаўкі, мінскай ускраіны. За плячыма — прафесіянальна-тэхнічная школа швейнікаў, работа на мінскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік», аўтарытэт і выбранне старшынёй Цэнтральнага Камітэта саюза швейнікаў, у які ўваходзіла больш за 17 тысяч чалавек. На пасаду старшыні Вярхоўнага Савета БССР яе «блаславіў» асабіста Сталін. Панцеляймон Панамарэнка, першы сакратар ЦК КП(б)Б, раней чым уносіць кандыдатуру Надзеі Рыгораўны на такую высокую пасаду, вырашыў абмеркаваць яе з Генеральным сакратаром ЦК ВКП(Б) — надта смелай была прапанова. Сталін кандыдатуру ўхваліў, парэкамендаваў толькі змяніць прозвішча з Грэк на Грэкаву. «Няхай усе ведаюць, што ў БССР узначальвае вярхоўны орган улады жанчына. Прозвішча Грэк няясна вызначае, жанчына гэта ці мужчына, а Грэкава — зразумела, што жанчына».

На першай сесіі Грэкаву аднагалосна абралі старшынёй Вярхоўнага Савета БССР. Тады ж былі прынятыя важныя для рэспублікі дакументы, якія замацоўвалі пастанову аб тэрытарыяльных зменах, што ўносіліся ў Канстытуцыю БССР. Насельніцтва з 1,6 мільёна жыхароў павялічвалася да 6 мільёнаў 122 тысяч, пасля таго, як у 1926 годзе ў склад БССР былі вернуты ўсходне-беларускія землі.

У той жа час у сістэму дзяржаўнага кіравання разам з Грэкавай уступалі такія ж маладыя, як і яна, кіраўнікі, многія з якіх у далейшым стануць палітычнымі фігурамі, і з іх імёнамі будуць асацыіравацца цэлыя перыяды гісторыі СССР — Андрэй Грамыка, Леанід Брэжнеў, Аляксей Касыгін, Мікалай Байбакоў, Панцеляймон Панамарэнка і іншыя. Многім няма і 30. І можна было б сказаць, што наступаў час маладых, калі б не адно «але»: крывавы тэрор 1930-х гадоў, які літаральна выкасіў партыйныя арганізацыі абласцей, рэспублік, а з імі і многіх кіраўнікоў. На долю Грэкавай прыйшоўся, відаць, самы складаны перыяд савецкай гісторыі — 30—50-х гадоў, калі ствāралася фактычна з нуля прамысловасць, фарміравалася сістэма кіравання, нарошчваўся культурны патэнцыял рэспублікі і практычна перманентна ішлі рэпрэсіі. Надзея Рыгораўна не толькі курыравала флагманы эканомікі на той перыяд — Аршанскі льнокамбінат і «Асінторф», якія былі на кантролі ЦК. Асноўная ўвага аддавалася мясцовай прамысловасці, горадаўтваральным прадпрыемствам у малых гарадах. Многія пасля сталі брэндамі рэспублікі: Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат, Быхаўскі агароднінакансервавы, Добрушская папяровая фабрыка і іншыя. Гэта дазволіла стварыць рабочыя месцы, істотна скараціць беспрацоўе. Змянялася і Ляхаўка — за кошт аб'яднання невялікіх прадпрыемстваў у адно створаны скурзавод «Бальшавік», «Энергія», дражджавы завод «Чырвоная зара», прадмесце Мінска станавілася развітым прамысловым раёнам. Пры гэтым патрапіць у жорны рэпрэсій было рэальнасцю таго часу. Па ўспамінах старэйшай дачкі Грэкавай, у кватэры заўсёды стаяў чамаданчык на выпадак арышту, а пасля работы яны з Панамарэнкам часта дамоў не ішлі, а гулялі па Мінску да раніцы: арыштаваць маглі ў любы момант, але здавалася, што днём гэта не так страшна.



Пасля рэгістрацыі шлюбу генерал-палкоўнік Міхаіл Малінін і старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава. 3 мая 1944 года.

Вось толькі некаторыя вытрымкі з «Запіскі сакратара ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкі кіраўніку Упраўлення кадраў ЦК ВКП(б) Г. Малянкову аб шкодніцтве ў кіраўніцтве рэспублікі. З ліпеня 1939 года»: «...у канцы 1937-га і пачатку 1938 года былі выключаны з партыі і па правакацыйных матэрыялах арыштаваны кіраўнікі партарганізацый: Бялыніцкага, Рудзенскага, Сенненскага, Бярэзінскага, Чэрвеньскага, Сіроцінскага, Кармянскага і шэрагу іншых раёнаў, ...выключаны з партыі і зняты з работы 24 сакратары райкамаў, 33 сакратары райкамаў партыі былі зняты з накладаннем розных партыйных спагнанняў, каля 35 сакратароў райкамаў былі арыштаваны, ...зняты з работы і арыштаваны каля 50 старшынь райвыканкамаў».

Грэкава ж спрабавала разабрацца, дзе праўда, а дзе даносы. Лісты ёй ішлі адусюль, і ў народзе іх называлі «слязніцамі». Пра давер сведчыў надпіс на канверце — замест адраса проста «Цёці Грэкавай», «Мінск, Грэкавай». Яна давала даручэнні самому Лаўрэнцію Цанаве. Як гэта яго раздражняла — адказы ён павінен быў накіроўваць на адрас нейкай жанчыны, ды яшчэ такой маладой. І людзей нярэдка апраўдвалі. Яна магла напрамую звярнуцца да Берыі, напрыклад, калі даносы датычыліся таго ж Панамарэнкі, і да меркавання беларускай партыйнай арганізацыі прыслухоўваліся. Гэта былі не проста ўчынкі, але і вялікая рызыка.

1939 год Грэкава назвала самым страшным у сваім жыцці. XVIII з'езд партыі асудзіў рэпрэсіі, і, здавалася, наступае новы перыяд. Грэкава, яго дэлегат, магла сама пераканацца ў гэтым, калі асабіста Сталін прыняў удзел у яе лёсе. Ішло галасаванне па складзе Цэнтральнай рэвізійнай камісіі ЦК ВКП(б): Берыя, Будзённы, Варашылаў... Нечакана Сталін папрасіў слова. Надзея Рыгораўна ўспамінала: «Сталін заўсёды гаварыў ціха. Ён падышоў да трыбуны і сказаў: «Я прапаную дапоўніць спіс — увесці ў склад Рэвізійнай камісіі таварыша Грэкаву». Пачуўшы з вуснаў Сталіна такую прапанову, я ледзь не ўпала з крэсла. Пасля ў маёй галаве пранеслася, што гэта не пра мяне ён гаворыць,

**Але за прывабным вобразам стаяла жанчына з моцным характарам, якой давялося вырашаць далёка не жаночыя праблемы. Адны толькі пытанні эканомікі пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР патрабавалі неверагодных намаганняў.**

а пра кагосьці з падобным на маё прозвішчам. Заўважыўшы маю збянтэжанасць, Сталін рукой паказаў на месца, дзе я сядзела з Панамарэнкам, і сказаў: «Як, таварышы з Беларусі? Не пярэчыце?» Пасля завяршэння з'езда дэлегатаў папярэдзілі пра фатаграфаванне. Надзея Рыгораўна, пабегла ў цырульню рабіць прычоску, а тут высвятляецца, што Іосіф Вісарыёнавіч ужо выехаў і фатаграфаванне ссоўваецца, у зале спешна расстаўляюць крэслы, збіраюцца дэлегаты, па Грэкаву ў цырульню тэрмінова адправілі ад'ютанта. Сталін прыбыў, яму дакладваюць, што сабраліся ўсе, акрамя Грэкавай, і асцярожна дадаюць, што яна... у цырульні. Сталін да сітуацыі аднёсся з разуменнем. Прапанаваў усім рассаджвацца і пачакаць таварыша Грэкаву. Сама ж яна (нават цяжка ўявіць яе стан у такі момант!) паспрабавала незаўважна зайсці ў залу і ўладкавацца ў апошнім радзе. Але Сталін павярнуўся ў яе бок і запрасіў у першы рад.

Надзея Рыгораўна разбурала многія стэрэатыпы аб дзелавой жанчыне. Модныя перавагі таго часу: чырвоная хустка, скуранка — всупраць, якую гісторыкі моды пасля назавуць стылем канструктывізму. Ва ўсім прастата, лаканічнасць, гэткі шарм па-пралетарску. Да яго распрацоўкі былі прыцягнуты вядомыя мастакі і нават скульптары, над ім працавала сама Вера Мухіна, аўтар знакамітай скульптуры «Рабочы і калгасніца». Грэкава ж фарміравала свой стыль, гэта дзелавы касцюм, пра неабходнасць якога тады спрачаліся, але з элементамі, якія падкрэсліваюць жаноцкасць, — элегантны шалік, карункі, брошка.

### «Куды паставіць памежны слуп?»

Але за прывабным вобразам стаяла жанчына з моцным характарам, якой давялося вырашаць далёка не жаночыя праблемы. Адны толькі пытанні эканомікі пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР патрабавалі неверагодных намаганняў — тэрыторыя рэспублікі павялічвалася са 125,5 тысячы кв. км да 225,7, а колькасць насельніцтва вырасла ў два разы і склала 10 мільёнаў 200 тысяч чалавек. Гэта спачатку ўсё эмацыянальна: сесія Вярхоўнага Савета, дэлегаты ад усіх рэгіёнаў Заходняй Беларусі, яскравыя асобы, выступленні. Але не абышлося і без курʼёзаў. «На трыбуну ўздымаецца вядомы ваеначальнік, — успамінала Надзея Рыгораўна. — У руках яго памежны слуп. Заканчваючы прамову, ён звяртаецца да мяне са словамі: «Таварыш старшыня Вярхоўнага Савета БССР, мяжа перанесена, куды загадаеце паставіць памежны слуп?» Вось так нумар. Я спачатку разгубілася вельмі, але пасля сабралася і стала даваць тлумачэнні. А работа сесіі транслявалася па цэнтральным радыё. Таварыш сваю прамову скончыў яшчэ і лозунгамі: «Даеш Варшаву! Даеш Берлін! І заўтра ўрэжамся мы ў Рым!» Не прайшло і пяці хвілін, як Панамарэнку тэрмінова з прэзідыума выклікалі да тэлефона, званіў асабіста Сталін, які строга спытаў: «Што ў вас там адбываецца на сесіі? (Гэта супала з заключэннем дагавора СССР і Германіі аб ненападзенні.) Чаму такія заклікі?» Давялося даваць тлумачэнні».

Сітуацыю разрадзіла выступленне сакратара Мінскага абкама партыі, які вырашыў выступаць на беларускай мове. Тэкст быў

надрукаваны. Літары рускія, але, не ведаючы беларускай мовы, ён няправільна пачаў ставіць націск: «Беларускі народ 20 гадоў жыў пад прымусам». У зале раздаўся смех. Суцішаць зал зноў давялося Грэкавай. Пасля Матвеева так і празвалі — «прымус».

У эканоміцы было ўсё не так гладка — і супрацьстаянне, і непрыманне насельніцтвам шэрагу непапулярных мер новай улады, і сабатаж. Усё, што датычылася Заходняй Беларусі, — на кантролі асабіста Сталіна. Шыфроўкі, запіскі, многа даручэнняў наўпрост Грэкавай, сярод іх аб пераходзе на савецкую валюту, аб непапулярных мерах па нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў, а яшчэ банкі, чыгунка, медустановы, школы. Меры прымаліся аператыўна, але не ўсё рэгулявалася жорсткімі рэзалюцыямі. Напрыклад, пасля вызвалення Брэста мэр горада, паляк, закрыў доступ да ўсіх баз харчавання і заявіў, што ў горадзе няма ні хлеба, ні мяса, ніякіх харчовых запасаў. Сабралі тэміновае пасяджэнне, усе выдатна разумелі, што такога быць не магло, для размовы запрасілі мэра. На польскай мове ён здзекліва заяўляў, што заваявальнікам ні хлеба, ні мяса, ні вады не дасць. Перакладчык перакладаў не з яго слоў, а сам прыдумваў адказы, маўляў, хочам дапамагчы, але ўсе фонды і рэсурсы выдаткаваныя, рады б, але не можам». Але Грэкава добра ведала польскую мову, таму пасля чарговых «тлумачэнняў наконт складанай сітуацыі» папрасіла зрабіць перапынак, падчас якога сказала Панамарэнку, што з іх проста здзекуюцца. Можна толькі ўявіць стан палякаў, калі Грэкава па-польску ўсё растлумачыла даволі даходліва. Хутка былі адкрыты ўсе крамы, базы, склады, паступова нармалізавалася жыццё.

## Узнагароды везла пад абстрэлам

Суровыя выпрабаванні прынесла вайна. Грэкава — сакратар Казанскага гаркама партыі. Як кавалі перамогу ў тыле, сведчаць прыклады. 19 ліпеня ў Казані ў яе адбылася першая сустрэча з акадэмікам Ота Шмітам, вядомым палярнікам, якому была даручана эвакуацыя навуковых устаноў, 23 ліпеня Казань ужо сустракала першыя эшалоны з людзьмі, абсталяваннем, а гэта 33 навуковыя ўстановы, 5 тысяч навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук СССР з сем'ямі, сярод іх 39 акадэмікаў, 44 члены-карэспандэнты, 17 НДІ з Масквы, Ленінграда, Прэзідыума Акадэміі навук СССР, Акадэміі навук Беларусі.

Ігар Курчатаў менавіта ў Казані пачынае работы па ядзернай праграме «Уран», па стварэнні ўранавай бомбы. І тут жа асабістыя праблемы, якія давялося вырашаць неадкладна, — сыпны тыф, які зваліў Курчатава пасля прыбыцця ў Казань. Сяргей Каралёў, Сяргей Вавілаў, які працаваў у Казані над стварэннем аптычных прыбораў для ўсіх відаў узбраення, Пётр Капіца — гэта далёка не поўны пералік выдатных вучоных, у вырашэнні праблем якіх непасрэдны ўдзел прымаў гаркам партыі. Да таго ж толькі ў кастрычніку ў Казань былі эвакуяваны адразу тры маторныя заводы з Варонежа і Масквы. Фронт меў вострую патрэбу ва ўзбраенні, людзі працавалі на знос. Толькі на адным Казанскім авіязаводзе № 22 за перыяд з 1941 да 1945 года было пастаўлена на крыло 10 174 самалётаў Пе-2, значыць, па 6 такіх баявых машын у суткі. Што датычыцца прадпрыемстваў, эвакуяваных з Беларусі, то ў жніўні—верасні 1941 года ўступіла ў строй 15 заводаў і фабрык. У кастрычніку—лістападзе — яшчэ 20. Да лета 1942 года абаронную прадукцыю выдавалі ўжо калектывы больш чым 70 беларускіх заводаў і фабрык. А яшчэ трэба вырашаць, як... накарміць сланоў, мартышак цырка Дурава, эвакуяванага ў Казань, на якіх харчовых картак не выпісалі, як размясціць тэатр аперэты, якога ў спісах на эвакуацыю не было. Давялося задзейнічаць рэзерв НКУС, артыстаў размясцілі ў ведамасным Доме культуры.

А яшчэ пастаянныя кантакты з беларусамі: арганізацыя сесіі Акадэміі навук у Казані, калі вучоных давялося збіраць па ўсім Саюзе, сувязь з паэтам Янкам Купалам, збор сродкаў для беларускіх партызан. Жыхары Казані прынялі рашэнне на працягу месяца працаваць на дзве гадзіны даўжэй і на атрыманыя сродкі купіць неабходныя для партызан рэчы — шапкі, целагрэйкі, валёнкі. Сама ж Грэкава імкнулася ў рэспубліку, і ў яе з'явілася такая магчымасць.

Як старшыня Вярхоўнага Савета БССР яна накіравалася на акупаваную тэрыторыю разам са старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Наталевічам і старшынёй Саўнаркама БССР Былінскім, каб асабіста ўручыць урадавыя ўзнагароды партызанам Суражскай зоны, хоць гэта можна было зрабіць і ў Крамлі. Да Калінінскага фронту ў іх распараджэнні быў транспарт, але гэта не ратавала ад абстрэлаў, налётаў фашысцкіх самалётаў. «У вялікіх трывогах і хваляваннях за захаванасць даверaных нам узнагародных дакументаў і ўрадавых узнагарод мы дабраліся да размяшчэння штаба Калінінскага фронту», — успамінала Грэкава. Адтуль з правадніком у глыбокі тыл уначы, дзе паўзком, дзе лежачы ў яры, чакалі, калі пройдуць нямецкія калоны. У вёсцы Дабрыніна, дзе сабраліся работнікі Віцебскага абкама партыі, героі-партызаны Суражскай зямлі, ім былі ўручаны ўзнагароды. Першым з яе рук сваю першую ўзнагароду атрымаў Мінай Шмыроў (легендарны бацька Мінай). Надзея Рыгораўна чатыры разы хадзіла за лінію фронту, і кожны раз гэта была неймаверная рызыка.



На мітынгу ў Мінску з нагоды ўз'яднання з Заходняй Беларуссю. Старшыня Вярхоўнага Савета БССР Надзея Грэкава і першы сакратар ЦК КП(б)Б Панцеляймон Панамарэнка. 1939 год.

У лістападзе 1943 года пасля вызвалення Гомеля Надзея Грэкава на чале ўрадавай камісіі вярталася ў Беларусь. Неабходна было не толькі ацаніць шкоду, але і пачаць аднаўленчыя работы, а яшчэ падрыхтоўку да сесіі Вярхоўнага Савета, першай на вызваленай тэрыторыі, якой надавалася асаблівае значэнне. Да пасады старшыні Вярхоўнага Савета БССР дадалася яшчэ адна — намеснік старшыні СНК. Гэтыя абавязкі яна выконвала да сакавіка 1947 года, фактычна ў самы складаны для рэспублікі час, калі ўсё рабілася па гарачых слядах, калі першай даводзілася ўваходзіць у спалены горад, у пакінуты фашыстамі канцлагер «Азарычы», аператыўна вырашаць задачы. Тады ж у штабе Беларускага фронту прагучаў тэлефонны званок са Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Званіў асабіста Сталін. Размова яго з камандуючым Ракасоўскім датычылася аказання дапамогі беларускай урадавай дэлегацыі ў падрыхтоўцы сесіі. У канцы Іосіф Вісарыёнавіч як бы незнарок дадаў: «Грэкава не замужам, а ў цябе начальнік штаба Малінін — удавец». З першым даручэннем усё было зразумела. А як быць з выкананнем другога? Для пачатку Малініна прызначылі адказным за аказанне дапамогі па падрыхтоўцы сесіі. Сам ён не мог зразумець, чаму, бо для гэтага існуе цэлы палітаддзел фронту, ды і як жа падрыхтоўка наступальнай аперацыі? Але ўсё змяніла першая сустрэча, Грэкава зрабіла на яго ўраганнае ўражанне, падрыхтоўкай сесіі ён зацікавіўся, пра што далажылі Ракасоўскаму, як і пра тое, што Малінін ёй не спадабаўся. Шлях да сэрца жанчыны аказаўся больш складаны, чым распрацоўка стратэгічнай аперацыі. Было ўсё: і прыгожы раман у лістах, і разгубленасць, і сітуацыя, калі здавалі нервы. У сакавіку 1944 года сесія прайшла паспяхова. Трансляцыю слухалі на фронце, у партызанскіх атрадах, яна несла надзею на хуткую перамогу. На ёй было прынята рашэнне аб стварэнні Народнага камісарыята замежных спраў Беларускай ССР. Упершыню пачаў работу і Народны камісарыят абароны Беларускай ССР. А Ракасоўскаму і члену Ваеннага савета Цялегіну пачалі дакладваць, што Малінін некуды перыядычна адлучаецца з размяшчэння штаба фронту. 3 мая 1944 года быў зарэгістраваны шлюб.

## Каханне, кар'ера, рэпрэсіі...

А каханне, падобнае на сон, Надзея Рыгораўна і Малінін пранеслі праз гады. Пасля рэгістрацыі шлюбу, яны раз'ехаліся па розных напрамках: перад кожным стаялі складаныя задачы. Для Міхаіла Сяргеевіча пачалася наступальная аперацыя, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Баграціён», для Грэкавай — гэта аднаўленне рэспублікі. Яшчэ ішла вайна. Аднаўлялі краіну неймавернымі намаганнямі: не было практычна спецыялістаў, проста людзей, калі ў ЦК ішлі тэлеграмы пра тое, што ў некаторых вёсках засталося па некалькі чалавек, і гэта ва ўмовах, калі гітлераўцы працягвалі здзяйсняць налёты, у сталіцы дзейнічалі ўзброеныя групы немцаў, якія не паспелі пакінуць горад, і тых, хто спецыяльна быў пакінуты для арганізацыі дыверсій. Пра сітуацыю можна меркаваць па запісцы Панамарэнкі на імя Малянкова і Берыі: «Мушу паведаміць, што будынак Дома ўрада ў Мінску два разы падпальваўся і быў выпадак пранікнення ў будынак ЦК тэрарыстычных элементаў. З прычыны засмечанасці варожымі элементамі і нямецкімі агента-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы